Козик Л. А.. [Рецензия] / Л. А. Козик // Российские и славянские исследования: науч. сб. / Белорус. гос.ун–т.; А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. — Минск, 2010. — Вып. 5. — С. 342–347. —Рец. на кн.: Волобуев В. В. Политическая оппозиция в Польше. 1956—1976 /отв. ред. А. М. Орехов. М. : Институт славяноведения РАН, 2009. 240 с.
.

**ВОЛОБУЕВ В. В. Политическая оппозиция в Польше. 1956—1976 /отв. ред. А. М. Орехов. М. : Институт славяноведения РАН, 2009. 240 с.**

У сучаснай расійскай гістарыяграфіі не так шмат даследаванняў, прысвечаных фар-міраванню і дзейнасці палітычнай апазіцыі ў Польшчы ў 1956—1976 гг. Значна больш увагі гісторыкі Расіі, як дарэчы і Беларусі, нада-валі падзеям непасрэдна 70—80-х гг. XX ст. [гл., напр., 1; 2; 3; 4]. У гэтай сувязі выхад манаграфіі В. Валабуева з'яўляецца несум-ненным крокам наперад у развіцці палані-стыкі на постсавецкай прасторы.

Ужо з першых радкоў В. Валабуеў спра-буе прадставіць чытачу сутнасць асноўных паняццяў, якія будуць выкарыстоўвацца ў тэксце, —«апазіцыя», «супраціўленне», «ідэ-алогія», даць перыядызацыю гісторыі ўзае-маадносін улады і грамадства «праз прызму развіцця апазіцыйных рухаў» (с. 4), ахарак-тарызаваць крыніцы і гістарыяграфію праб-лемы. На наш погляд, за добрым веданнем сучасных падыходаў і паліталагічных азна-чэнняў аўтар так і не змог дакладна акрэсліць сваёй уласнай пазіцыі. Так, ён адзначае, што «ў дадзенай працы рамкамі апазіцыі аб'яд-ноўваюцца ўсе праявы арганізаванай і сты-хійнай незадаволенасці польскага грамадства палітыкай кіруючага рэжыму» (с. 4), але ўслед за гэтым піша, што ў даследаванні не разгля-даюцца спецыяльна «стыхійныя пратэстныя тэндэнцыі ў асяроддзі народных мас» (с. 6).

Пытанні выклікае і прыведзеная ва ўво-дзінах перыядызацыя ўзаемаадносін улады і грамадства, якая фактычна супярэчыць храналагічным рамкам даследавання. В. Вала-буеў вылучае чатыры перыяды: 1944—1948,1948—1956, 1956—1980, 1980—1989 гг., што сапраўды адлюстроўвае змены ва ўзаемаадно-сінах улады і грамадства, але не тлумачыць, чаму аўтар абраў менавіта 1976 г. у якасці вер-хняй мяжы свайго даследавання. Між іншым такі выбар падаецца нам правільным, бо з'яў-ленне ў 1976 г. Камітэта абароны працоўных (КОР) азначала новы этап у фарміраванні апазіцыйных настрояў і складванні арганіза-ванага руху. Пра гэта ж гаворыць і сам аўтар у выснове да чацвёртай главы, калі адзначае, што «стварэнне КОРа (Камітэта абароны працоўных) і РОПЧО (Рух у абарону правоў чалавека і грамадзяніна) стала толькі знешнім, арганізацыйным завяршэннем працэсаў, якія адбываліся ў асяроддзі апазіцыі ў канцы 1960-х — пачатку 1970-х гадоў» (с. 214).

Пры правядзенні даследавання расійскі гісторык засяродзіў увагу на трох плынях польскай апазіцыі і іх ідэалогіях: марксісц-кай, заснаванай на крытыцы кіруючага рэ-жыму з камуністычных пазіцый; грамадска-палітычных канцэпцыях свецкіх католікаў; аб'яднаннях, якія абапіраліся на дактрыны нацыянальна-патрыятычнага кшталту (с. 6). Акцэнт жа пераважна быў зроблены на ўнут-рыпартыйныя апазіцыйныя плыні, якія і сап-раўды адыгрывалі істотную ролю ў фарміра-ванні «іншага бачання» перспектыў развіцця Польшчы.



Несумненным штуршком да з'яўлення апазіцыйных настрояў сярод насельніцтва сталі падзеі 1956 г., калі былі перагледжаны ранейшыя падыходы да кіравання краінай, дадзена ацэнка перагібам у яе пасляваенным развіцці і прадпрынята спроба «выправіць» існуючае становішча. Вялікая роля ў ажыц-цяўленні перамен адводзілася грамадствам былому першаму сакратару Польскай рабо-чай партыі, ініцыятару «польскага шляху да сацыялізму», а потым ахвяры сталінскай ма-дэлі сацыялізму Уладзіславу Гамулцы, які ў кастрычніку 1956 г. вярнуўся да ўлады.

Першую главу аўтар прысвяціў разгляду ўнутрыпартыйных плыняў апазіцыі ў перы-яд з 1956 г. па ліпень 1963 г. Важную ролю ў фарміраванні «іншадумства» В. Валабуеў ад-водзіць творчай і навуковай інтэлігенцыі, якая праз свае перыядычныя выданні змагла пад-штурхнуць грамадства да адкрытага абмер-кавання існуючай у краіне сітуацыі. Аналізу-ючы настроі насельніцтва ў цэлым, аўтар справядліва заўважае, што большасць паля-каў у сярэдзіне 1950-х гг. не выступала суп-раць сацыялістычных ідэалаў, а бытавы эга-літарызм пераплятаўся ў свядомасці народа з антысемітызмам і нацыяналізмам, у той час як «уласная кіруючая партыя карысталася ў грамадстве значным даверам» (с. 17). Мена-віта гэтым ён тлумачыць той факт, што на чале руху 1956 г. знаходзіліся прадстаўнікі левых поглядаў.

Характарызуючы рост дыскусій у перыя-дычных выданнях і грамадскіх аб'яднаннях інтэлігенцыі (кшталту Клуба Крывога кола), В. Валабуеў адзначае, што найбольш часта абмяркоўваліся наступныя пытанні: 1) пера-адоленне сталінізму і роля партыі ў грамад-стве; 2) плюралізм меркаванняў і дэмакра-тычныя свабоды; 3) роля інтэлігенцыі ў гра-мадстве; 4) стаўленне да нацыянальна-пат-рыятычных

руxаў; 5) праблема нацыяналь-най незалежнасці; 6) партыйнасць у літара-туры і мастацтве, свабода мастацкай твор-часці (с. 28). На гэтым фоне значнае месца адводзіцца характарыстыцы сітуацыі ў Саюзе польскіх літаратараў (СПЛ), дзе спрэчкі аб свабодзе творчасці і слова з кожным днём набывалі моц і выходзілі на старонкі газет.

Адной з найбольш важных з'яў у грамад-скай думцы ПНР у 1956 г. стала фарміраван-не ўнутрыпартыйнай апазіцыі, якая па сва-ёй сутнасці была камуністычнай, але суп-рацьпастаўляла сябе афіцыйнай дактрыне Польскай аб'яднанай рабочай партыі (ПАРП). Прааналізаваўшы яе дзейнаць і тэарэтычную базу, В. Валабуеў вылучыў на-ступныя характэрныя рысы: 1) атаясамліван-не падзей 1944—1945 гг. і крызісу 1956 г. з са-цыяльнай рэвалюцыяй, якая дазваляе Польшчы наблізіцца да камунізму; 2) кры-тыка сталінізму як вучэння, якое абсалютна змяніла сутнасць вучэння марксізму-леніні-зму і адсюль неабходнасць «вярнуцца да вы-токаў»; 3) крытычнае стаўленне да мінулага ПАРП пры адначасовай падтрымцы яе ролі як кіруючай сілы ў польскім грамадстве; 4) дваякая ацэнка «рэвалюцыі» 1956 г. як са-цыяльнага і нацыянальнага феномена, які спрыяе фарміраванню нацыянальнага шляху да сацыялізму; 5) жаданне арганізацыйна адасобіцца ад ПАРП і пры гэтым захаванне ўпэўненасці ў правільнасці агульнага на-прамку развіцця краіны (с. 38—40).

Перамены, якія адбыліся ў Польшчы во-сенню 1956 г., не змянілі, як справядліва ад-значае аўтар, сутнасць рэжыму, які меў усе прыкметы аўтарытарызму. Дадатковым свед-чаннем гэтага стала адмова ад далейшых рэ-форм па лібералізацыі грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця, а таксама пасіленне пазіцый «дагматыкаў», звязаных з кітайскімі і албанскімі камуністамі. Аднак не яны сталі галоўнай пагрозай для У. Гамулкі і блізкага яму асяроддзя. Генеральны сакратар ПАРП бачыў значна большую небяспеку з боку так званых «рэвізіяністаў», якія выступалі суп-раць аўтарытарных метадаў кіравання краі-най. Да іх належалі вядомыя члены партыі, у тым ліку журналіст Р. Зіманд, пісьменнік В. Варашыльскі, філосаф Л. Калакоўскі і інш.

Характарызуючы шматлікія выказванні як шэраговых партыйных дзеячаў, так і кіраў-ніцтва, В. Валабуеў прыйшоў да высновы, што польскі «рэвізіянізм» праяўляўся ў праг-рамах альбо крытычных прапановах, якія былі накіраваныя на перагляд асноўных прынцыпаў функцыянавання палітычнай,



эканамічнай і ідэалагічнай сістэмы ў ПНР, але не падвяргаў сумненням каштоўнасці марксісцкай ідэалогіі і не выступаў супраць звяржэння існуючага грамадска-палітычна-га ладу ПНР (с. 49). У. Гамулка, які адчуваў усё большую небяспеку менавіта ў выказ-ваннях «рэвізіяністаў», ужо ў канцы 1950-х гг. пачаў праводзіць палітыку вяртання да моц-най, цэнтралізаванай улады, што адлюстра-валася ў змене кіраўніцтва СПЛ (1959), зак-рыцці Клуба Крывога кола (1962) і папуляр-ных штотыднёвікаў «Нова культура» і «Пшэг-лёнд культуральны» (1963) і інш. Канчатко-вая кропка была пастаўлена на XIII пленуме ЦК ПАРП (ліпень 1963 г.), які многія ацанілі як згортванне «адлігі».

У другой главе аўтар разглядае развіццё ўнутрыпартыйнай апазіцыі ў 1964—1968 гг. Фактычным пачаткам выступленняў 1960-х гг. ён лічыць «Ліст 34-х», накіраваны віднымі прадстаўнікамі культуры і навукі да прэм'ер-міністра Ю. Цыранкевіча ў знак пра-тэсту супраць праводзімай у краіне культур-най палітыкі і абмежавання паперы на вы-данне кніг і часопісаў. Прааналізаваўшы вя-лікую колькасць архіўных дакументаў, В. Ва-лабуеў паказвае рэакцыю грамадства і ўлад на распаўсюджанне тэксту ліста як у краіне, так і за яе межамі. Ён справядліва адзначае, што падзеі вакол «Ліста 34-х» сведчылі аб па-чатку адкрытага канфлікту паміж часткай інтэлігенцыі і кіруючым рэжымам.

Яшчэ адной значнай падзеяй ва ўзаема-адносінах улады і грамадства стала дзейнасць Я. Кураня, К. Мадзелеўскага і так званых «камандасаў» — студэнтаў Варшаўскага уні-версітэта, якія выйшлі з Клуба шукальнікаў супярэчнасцей (назва «камандасы» замаца-валася пасля таго, як яны пачалі выкарысто-ўваць тактыку «дыверсій» падчас паседжан-няў Саюза сацыялістычнай моладзі, што вельмі нагадвала дзеянні ізраільскіх спецпад-раздзяленняў у тыле арабскіх войскаў). Ана-лізуючы ўчынкі студэнтаў, аўтар дае ацэнку «Адкрытага ліста» (1965) Я. Кураня і К. Мад-зелеўскага, іх арышту і рэакцыі на судовы працэс у Варшаўскім універсітэце. Звярта-ецца ён і да справы г. зв. «трацкістаў» (1966), якая ў адрозненні ад папярэдняй не атрымала водгуку ў грамадстве. Прычыну апошняга В. Валабуеў бачыць у тым, што ў сярэдзіне 1960-х гг. інтэлігенцыя губляе інтарэс да пы-танняў аб шляхах і метадах будаўніцтва са-цыялізму ў ПНР і ролі кампартыі (с. 95).

Асобны раздзел манаграфіі прысвечаны сходу на гістарычным факультэце Варшаў-скага універсітэта 21 кастрычніка 1966 г., які фактычна быў скліканы ў сувязі з 10-й гада-вінай вяртання да ўлады У. Гамулкі. У той час як афіцыйныя структуры, у тым ліку сродкі масавай інфармацыі, фактычна праігнара-валі гэты «юбілей», ва універсітэце выступіў прафесар Л. Калакоўскі. Як вядома, за свае выказванні, сутнасць якіх зводзілася да таго, што ўсе дасягненні «польскага кастрычніка» 1956 г. былі страчаны, ён быў выключаны з шэрагаў ПАРП, а ў знак салідарнасці з ім з партыі выйшла частка вядомых дзеячаў культуры і навукі. У гэтай сувязі аўтар даследа-вання спрабуе паказаць паводзіны

партый-нага кіраўніцтва як краіны ў цэлым, так і непасрэдна партыйных арганізацый на мес-цах. Найбольшую ўвагу ён засяроджвае на сітуацыі ў СПЛ, дзе ў гэты час прыхільнікі курсу партыйнага кіраўніцтва перайшлі ў наступленне (с. 103).

На фоне росту незадаволенасці творчых і навуковых колаў грамадства В. Валабуеў звяртаецца да характарыстыкі антысіянісц-кай кампаніі 1967—1968 гг. Аналізуючы па-дзеі, аўтар падводзіць да слушнай, на наш погляд, высновы, што яе прычынай стала жа-данне партыйнай фракцыі «партызан» вы-цесніць сапернікаў з органаў улады і дзяр-жаўных устаноў. Пад сапернікамі часцей за ўсё разумелі тых камуністаў, якія ў свой час былі бліжэйшымі паплечнікамі Б. Берута і ў пераважнай большасці мелі габрэйскія ка-рані. Апошні факт дазваляў уладам маніпу-ляваць настроямі ў польскім грамадстве і выказваць меркаванні накшталт таго, што ва ўсіх перагібах пасляваеннага развіцця краі-ны былі вінаватыя менавіта яўрэі, а не па-лякі, а імкненне першых да лібералізацыі грамадскага жыцця ў 1956 г. было выклікана жаданнем пазбегчы адказнасці за свае зла-чынствы. Як бы там ні было, але ў 1967—1968 гг. ад антысіянісцкай кампаніі ў першую



чаргу пацярпелі былыя праціўнікі У. Гамулкі. Аналізуючы ўплыў згаданых падзей на развіццё апазіцыйнага руху, В. Валабуеў пры-ходзіць да разумення таго, што палітычны кампраміс, як і ідэалагічныя дыскусіі, з ула-дамі ў той час быў немагчымы, што падштур-хоўвала «рэвізіяніСцкую» апазіцыю да пера-ходу ў лагер апанентаў ПАРП (с. 107).

1968 год у Польшчы характарызаваўся яшчэ адной важнай з'явай: у сакавіку гэтага года ў краіне разгарнуўся моцны грамадскі рух, штуршком да якога стала забарона тэат-ральнай пастаноўкі п'есы А. Міцкевіча «Дзя-ды». Першым на гэты факт адрэагавала сту-дэнцтва Варшаўскага універсітэта, да якога ў хуткім часе далучыліся некаторыя дзеячы культуры. Аналізуючы падзеі 1968 г., у тым ліку ўнутраныя ідэалагічныя сутычкі сярод студэнцкіх груповак і рэакцыю афіцыйных улад, В. Валабуеў прыходзіць да высновы, што «рэвізіянізм» як альтэрнатыўная плынь марксісцкай думкі ў канцы 1960-х гг. знікае, а частка сацыялістычна арыентаванай інтэ-лігенцыі перастае атаясамліваць сябе з ула-дай і пераходзіць у адкрытую апазіцыю (с. 118—119). Разам з гэтым ён адзначае, што ў драматычны перыяд у жыцці краіны толькі лічаныя прадстаўнікі апазіцыі знайшлі муж-насць выступіць з адкрытым пратэстам, а самай галоснай справай стала самаспаленне 8 верасня 1968 г. падчас усерэспубліканскага свята ўраджаю працоўнага Р. Сіўца.

На фоне добра апісанай унутрыпартый-най апазіцыі значна менш месца ў манаг-рафіі адводзіцца характарыстыцы нацыя-нальна-патрыятычнай і свецка-каталіцкай плыняў палітычнай апазіцыі. Сярод іх аўтар звярнуў увагу на дзеянне Аб'яднання ПАКС (створана ў 1947 г.), якое фармальна ўзнікла як рух свецкіх католікаў, але не разглядалася польскім епіскапатам як сапраўды каталіц-кая арганізацыя. У сваю чаргу, улада аказва-ла яму ўсялякую падтрымку і дапамогу, што, як слушна заўважае В. Валабуеў, не дазваляе лічыць ПАКС апазіцыяй (с. 128).

У гэтай сувязі ў манаграфіі перавага ад-даецца разгляду так званага «новага пазіты-візму», сутнасць якога, па характарыстыцы аднаго з ідэолагаў С. Стомы, зводзілася да звязанага на агульных геапалітычных інта-рэсах саюза Польшчы з СССР, адмаўлення палітычнага рэалізму і схільнасці да кампра-місу, крытычнага стаўлення да мінулага сва-ёй краіны (с. 128).

Найбольш яскравым прыкладам працы ў гэтым накірунку сталі штотыднёвік «Ты-試днік Павшэхны» і часопіс «Знак», ідэала-гічны падмурак дзейнасці каторых (ад «ката-ліцкага мінімалізму» да «адкрытага каталі-цызму») характарызуе ў сваёй працы В. Ва-лабуеў. З улікам таго, што публіцысты гэтых выданняў выступалі ў абарону праў працоў-ных і супраць нацыяналізму, капіталізму і камунізму, аўтар спрабуе паказаць уплыў гра-мадска-палітычных падзей на погляды, вы-казванні і ўчынкі найбольш вядомых прад-стаўнікоў свецкіх католікаў, у першую чаргу С. Кісялеўскага. Варта адзначыць, што расійскі даследчык прыклаў вялікія нама-ганні, каб разабрацца ў хітраспляценнях уза-емаадносін паміж аб'яднаннямі і рознага кшталту выданнямі свецкіх католікаў, што праявілася ў яскравай характарыстыцы руху «Знак», рэдакцыйнай палітыцы часопіса «Вензь», Цэнтра дакументацыі і грамадскіх даследаванняў, прыхільнікаў былога лідара Стронніцтва працы К. Попеля, які ў 1946 г. распусціў партыю, а сам эмігрыраваў.

Асобную пазіцыю ў польскім апазіцый-ным руху 1956—1976 гг. займалі аб'яднанні нацыянальна-патрыятычнага кшталту. У сва-ёй большасці яны пачалі ўзнікаць у 1956 г., калі вяртанне да ўлады У. Гамулкі ў значнай ступені атаясамлівалася ў грамадстве з ад-раджэннем нацыянальнай самасвядомасці, якая, у сваю чаргу, была цесна звязана з рэлі-гійнасцю большасці палякаў. Аналізуючы псіхалогію польскага народа, В. Валабуеў адзначае, што насельніцтва ўспрымала сябе і краіну як частку заходняга свету, што не дазволіла замацавацца тут камуністычнай ментальнасці ў савецкім выглядзе (с. 143). Больш таго, «пытанне суверэнітэту ў света-поглядзе народа насіла не столькі палітыч-ную, колькі

нацыянальна-культурную афар-боўку і нярэдка праяўлялася ў міжнацыяналь-най напружанасці» (с. 144), а таму, па мерка-ванні аўтара, не выклікае здзіўлення распаў-



сюджанне антысавецкіх і антырускіх на-строяў у польскім грамадстве.

Нелегальныя антыўрадавыя групы ў ад-паведнасці з іх сацыяльным складам В. Вала-буеў умоўна падзяляе на два віды: «студэнц-ка-інтэлігенцкія» і «рабоча-сялянскія» (с. 145). Да апошняга ён адносіць Нацыянальна-дэ-макратычную лігу, якая ўзнікла на рэштках Саюза маладых дэмакратаў (існаваў з ліста-пада 1956 па студзень 1957 г.) і абвясціла сябе працягам Нацыянальнай партыі Р. Дмоў-скага, і арганізацыю «Рух», створаную ў 1965 г. як «пратэст супраць таталітарнай палітычнай сістэмы» (с. 151). Абапіраючыся на даныя польскіх спецслужбаў з архіва Інстытута на-цыянальнай памяці, В. Валабуеў падрабязна апісвае сацыяльны склад гэтых аб'яднанняў, іх ідэалагічны падмурак і праграмы, асноў-ныя напрамкі дзейнасці. Што тычыцца «ра-бочa-сялянскіх» груп, то аўтар адзначае, што сваёй мэтай яны ставілі барацьбу супраць існуючага ладу, але іх функцыянаванне ад-бывалася пераважна не ў палітычнай, а куль-турна-бытавой сферы. Больш таго, яны былі дрэнна закансіправаныя, а таму лёгка вык-рываліся спецслужбамі (с. 145).

Асобны раздзел манаграфіі прысвечаны дзейнасці гурткоў самаадукацыі і клубаў інтэ-лігенцыі. Характарызуючы першы від аб'яд-нанняў, аўтар паказвае іх імкненне захаваць інтэлектуальную традыцыю Польшчы перы-яду падзелаў і адначасова супрацьстаяць «са-вецкаму імперыялізму» (с. 154—155).

Сярод найбольш вядомых клубаў інтэлі-генцыі несумненна на першы план выходзіць Клуб Крывога кола (1956—1962), які неадна-разова згадваўся ў папярэдніх главах кнігі. У гэтай сувязі аўтар паспрабаваў не паўтарыц-ца, а таму засяродзіў увагу на кнізе аднаго з відных дзеячаў гэтага аб'яднання Е. Едліц-кага пад назвай «Хамы і яўрэі», якая выйшла ў выдавецкай серыі парыжскай «Культуры» ў 1963 г., кантактах клуба са згаданым часо-пісам, сітуацыі вакол «Ліста 34-х», судовых справах М. Ваньковіча (1964), Я. Н. Мілера (1964—1965), Ш. Шэхтэра і Н. Карсофа (1966—1967), Я. Шпотаньскага (1967—1968), П. Ясеніцы (1968). У высnове аўтар адзна-чае, што прадстаўленая нацыянальна-патры-ятычнымі рухамі апазіцыя не была цэласнай з'явай, а таму не магла эфектыўна распаў-сюджваць свае ідэі сярод інтэлігенцыі. Больш таго, яе дзейнасць адсочвалася ўладамі, а ідэі істотна адрозніваліся ад ідэй і мэт «рэвізіяні-стаў» і свецкіх католікаў (с. 169).

У апошняй, чацвёртай, главе манаграфіі В. Валабуеў разглядае эвалюцыю апазіцый-ных плыняў у снежні 1970 г. — чэрвені 1976 г. Ён характарызуе ўнутраную палітыку новага кіраўніцтва краіны на чале з Эдвардам Герэ-кам, аналізуе яе перамены і пераймальнасць, паказвае працэс выспявання дэмакратычнай апазіцыі і яе ідэалагічнага падмурка праз па-раўнанне меркаванняў Л. Калакоўскага, Я. Дрэўноўскага, Я. Кураня, А. Літвіна,

А. Бромке, А. Міхніка, прыводзіць погляды Л. Калакоўскага на тэорыю К. Маркса і сацы-ялізм, змены ў пунктах гледжання свецкіх ка-толікаў. Аўтар адзначае, што падчас пошуку канцэпцыі для апазіцыі на пачатку 1970-х гг. назіраецца спад актыўнасці пісьменніцкай «фронды», што тлумачыць, спасылаючыся на партыйныя дакументы, паляпшэннем іх ма-тэрыяльнага становішча і станоўчым рэзанан-сам ад сустрэчы з прадстаўнікамі партыйна-га кіраўніцтва (с. 193, 195).

Не застаецца па-за ўвагай даследчыка і такая істотная з'ява ў грамадска-палітычным жыцці Польшчы сярэдзіны 1970-х гг., як кам-панія, выкліканая пратэстам інтэлігенцыі супраць унясення трох паправак у Кансты-туцыю: абвяшчэнне ПАРП кіруючай сілай польскага грамадства, палажэнне аб саюзе з СССР і ўвязванне праў чалавека з выканан-нем ім абавязкаў. У гэтай сувязі В. Валабуеў апісвае гісторыю ўзнікнення «Ліста 59-ці» і характарызуе пазіцыю групы «Знак». Ён ад-значае, што ў перыяд зніжэння грамадскай актыўнасці на пачатку 1970-х гг. адбылося «канчатковае ідэйна-палітычнае размежаван-не паміж уладай і тымі напрамкамі апазіцыі, якія дагэтуль выказвалі сваю падтрымку прынцыповым асновам сацыялістычнага ладу ў Польшчы» (с. 214), а канстытуцыйная кампанія стала адным з чарговых этапаў у складванні дэмакратычнай апазіцыі.

Падводзячы высновы даследавання, В. Валабуеў заўважае, што палітычная апа-



зіцыя ў ПНР у 1956—1976 гг. была адначасо-ва ўнутрысістэмнай і пазасістэмнай з'явай, дзе розніца паміж разнастайнымі напрамкамі часцей за ўсё праяўлялася ў метадах (легальных ці нелегальных) барацьбы з палітыкай уладаў. Больш таго, «абмежаваны нацыя-нальны суверэнітэт» Польшчы спрыяў рас-паўсюджанню антысавецкіх настрояў і імкненню пазбавіцца ад апекі СССР, што стварала сацыяльную базу апазіцыі. Дадат-ным фактарам у гэтым выступала і варожае стаўленне ўлады да каталіцкай царквы, якая мела і змагла захаваць вялікі аўтарытэт сярод большасці насельніцтва.

Імкнучыся стварыць аб'ектыўны вобраз грамадска-палітычнай сітуацыі ў Польшчы ў сярэдзіне 1950-х — сярэдзіне 1970-х гг., В. Валабуеў адначасова адзначае, што вялі-кую ролю ў фарміраванні пасляваенных ад-носін улады і насельніцтва адыграла станоў-чае ўспрыняцце апошнім «цывілізацыйнага скачка» і ўсталявання польскай дзяржаўнасці на землях Памор'я, Сілезіі, часткі Усходняй Прусіі і ў Гданьску. Аднак прыход у канцы 1960-х — пачатку 1970-х гг. новага, маладога пакалення, якое не ведала рэчаіснасці міжва-еннай Польшчы, бачыла залежнасць краіны ад СССР і адчувала расчараванне неспраў-джанымі сацыялістычнымі ідэаламі, стварыў падмурак якасна новай апазіцыі, якая ў по-ўны голас заявіла пра сябе ў другой палове

1970-х—1980-я гг. Ацэньваючы ў цэлым плён-ную працу В. Валабуева, хочацца адзначыць яе высокі навуковы ўзровень. Аснову манаг-рафіі саставіла вялікая колькасць рознага роду гістарычных крыніц, сярод якіх істотна вылучаюцца дакументы польскіх і расійскіх архіваў, а таксама багатая польская гістары-яграфія. Варта заўважыць і той факт, што аў-тар змог захаваць пэўную дыстанцыю і не паддацца на часам вельмі прывабныя, але эмацыянальныя ці палітычна ангажаваныя ацэнкі польскай рэчаіснасці сярэдзіны 1950-х — сярэдзіны 1970-х гг.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Гришин, Я. Я.* Истоки кризисов / Я. Я. Гришин. Казань : Изд-во Казанского ун-та, 1993. 172 с.
2. *Лойко, Л. В.* Политическая борьба в Польше (70—80 гг.) / Л. В. Лойко. Минск : «Заві-гар» — Беларус. мінуўшчына, 1995. 224 с.
3. *Лыкошина, Л. С.* Польский кризис 80-х годов и его отражение в общественном сознании / Л. С. Лыжошина. М. : ИНИОН РАН, 1993. 172 с.
4. *Трубников, В.* Крах операции «Полония», 1980—1981: док. очерк / В. Трубников. М. : Вы-шэйш. шк., 1983. 246 с.